***Н. Г. Клімава,***
***М. Г. Антанюк-Пруто,***
***А. Г. Антанюк***

# УСПАМІНЫ ПРА МАЦІ

Нарадзілася наша матуля 22 красавіка (афіцыйна 28 красавіка) 1949 г. у маленькай палескай вёсцы Ломыш Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Гэтай вёскі сёння ўжо няма на карце Беларусі.

Дзяцінства было нялёгкім. Наша бабуля, Праскоўя Іванаўна Бендэга, выхоўвала дзвюх дачок у пасляваенны час без мужа і якой-небудзь дапамогі.



Маці Любові Адамаўны – Праскоўя Іванаўна Бендэга.



Маленькая Люба (справа) з сястрой Нінай (злева). Вёска Ломыш, 1954 г.

Маці не вельмі любіла расказваць пра гэты перыяд і ніколі не скардзілася на свой лёс. Але мы ведаем ад родзічаў, што жыццё гэтай сям'і было цяжкім.

Маленькай Любові трэба было хадзіць сем кіламетраў пешкі ў школу ў любое надвор'е. У той вёсцы, дзе была школа, жыла яе родная цётка, якая заўсёды была гатовая прыняць на ноч пляменніцу, але тая

адмаўлялася і бегла дадому, каб дапамагчы сваёй маці на ферме і па гаспадарцы. Цётка ўспамінае, што толькі вялікая завіруха магла спыніць Любу і прымусіць яе застацца. І пазней усё сваё жыццё Любоў Адамаўна вельмі клапацілася пра сваю маці.

Варта сказаць, што пры ўсіх складанасцях маленькая Люба была выдатніцай у школе! Гэта, безумоўна, сведчыць аб моцным характары, здольнасцях і душэўных якасцях, якія праяўляліся з дзіцячага ўзросту.

Ужо тады Люба мела мару – атрымаць вышэйшую адукацыю. І ў 1966 г. яе мара здзейснілася! Яна паступіла ў Мазырскі дзяржаўны педінстытут, па заканчэнні якога атрымала дыплом з адзнакай.

У 1970 г. маці паступіла ў аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР.



За работай у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук БССР. Мінск, 1973 г.

Перыяд навучання ў аспірантуры быў вельмі шчаслівым для яе – менавіта ў гэты час яна сустрэла нашага бацьку – Антанюка Георгія Аляксандравіча, тады аспіранта, а сёння доктара філасофскіх навук, прафесара.У 1971 г. яны ажаніліся, і ў 1972 г. у іх нарадзілася першая дачка Надзея. А ў 1974 г. Любоў Адамаўна абараніла кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную праблемам граматычнага ладу сучаснай беларускай мовы.

Трэба сказаць, што дачка Надзея скончыла тэхналагічны ўніверсітэт і сёння з’яўляецца высакакласным спецыялістам у галіне інфармацыйных тэхналогій, працуе на Мінскім заводзе халадзільнікаў «Атлант».

У 1977 г. нарадзілася другая дачка Марына.

Сям’я маладых вучоных пэўны час жыла ў аспіранцкім інтэрнаце побач з Акадэміяй навук. Надзея і Марынахадзілі ў дзіцячы садок каля музея Я. Коласа. Праз 9 гадоў сям’я нарэшце пераехала ў прасторную ўласную кватэру, дзе нават быў асобны пакой для бібліятэкі, якая была асаблівай сямейнай каштоўнасцю і гонарам. Аб такой раскошы маленькая Люба не магла і марыць, вяртаючыся са школы марознымі зімовымі вечарамі ў бедную вясковую хатку.

Плённая навуковая праца і значныя жыццёвыя падзеі заўсёды ішлі поруч. У 1989 г. нарадзіўся сын Аляксандр, а ўжо ў 1992 г. маці паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю па праблемах беларускай тэрміналогіі і атрымаланавуковую ступень доктара філалагічных навук.



За работай над доктарскай дысертацыяй. Мінск, 1980-я гг.

«Вашай маці трэба помнік паставіць: яна і доктар навук, і прафесар, і маці траіх дзяцей. Гэта ж такая руплівая праца і такі вялікі поспех!» – нярэдка казалі нам людзі. І сапраўды, наша маці была выдатнай жанчынай і таленавітым навукоўцам. Мы заўжды ведалі, что нам пашчасціла

нарадзіцца ў незвычайнай сям'і, сям'і двух вучоных, двух дактароў навук, прафесараў – гэта вялікая рэдкасць. Атрымалася так таму, што маці і бацька заўсёды падтрымлівалі і стымулявалі адзін аднаго да прафесійнага развіцця і новых дасягненняў. Навуковыя дыскусіі на філасофскія і філалагічныя тэмы былі нормай у нашым паўсядзённым жыцці. Гэтую атмасферу асветы і навукі мы ўбіралі з маленства.

Вось і наш брат Аляксандр пайшоў па дарозе прагрэсу, сёння ён з'яўляецца высакакласным спецыялістам IT-сферы, кіруе стварэннем мабільных аплетаў для замежных карпарацый. Мы ганарымся ім. Маці была б вельмі шчаслівая назіраць за поспехамі свайго сына!

Вялікую частку свайго жыцця (з 1974 г. па 1991 г.) Любоў Адамаўна аддала любімай працы ў Інстытуце мовазнаўства, дзе актыўна займалася праблемамі тэрміналогіі і ажыццявіла першае ў беларускім мовазнаўстве комплекснае тэарэтычнае даследаванне беларускай навуковай тэрміналогіі.



У доме адпачынку пад Мінскам. Другая палова 1980-х гг.



Навуковы калектыў пад кіраўніцтвам акадэміка М. В. Бірылы.
Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук БССР.1980-я гг.



З супрацоўнікамі Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук БССР.
Другая палова1980-х гг.

Яна супрацоўнічала з міжнароднымі арганізацыямі, была віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай арганізацыі па ўніфікацыі тэрміналагічных неалагізмаў. У сямейным архіве, сярод іншых, захавалася асабістае запрашэнне ад прэзідэнта гэтай арганізацыі, вядомага польскага вучонага З. Статберскага са словамі: «Ваши предложения настолько интересны, что я бы хотел, чтобы Вы выступили на Конгрессе в Варшаве. Это было бы большое достижение советской делегации из Белорусской ССР».


FÉDÉRATION INTERNATIONALE DES TRADUCTEURS
INTERNATIONAL FEDERATION OF TRANSLATORS

IX[e] Congrès mondial

Varsovie 6–13 mai 1981

Варшава, дня 7 ноября 1980 г.

Тов. Л. Антонюку
Кандидату филологических наук
Ученому секретарю Терминологической комиссии
Академии наук БССР
Институт Языкознания
Ленинский Пр. 68
220[illegible] МИНСК

Глубокоуважаемый Товарищ Профессор,

Спасибо Вам большое за Ваше последнее письмо!

В приложении пересылаем Вам несколько информаций о IX Мировом Конгрессе ФИТ-а в Варшаве, на котором много места будет посвящено проблемам научной терминологии. Настоящим письмом, как Председатель Оргкомитета, приглашаю Вас, Академика Николая Васильевича Бирилло и Ваших сотрудников по вопросам терминологии, принять участие в работе Конгресса.

УНИТЕРМ это предлагаемое название МКУТН – Международного комитета унификации терминологических неологизмов вместе с Мировым банком международных терминов. В приложении найдёте мою статью на эту тему опубликованную в "Пшеглонде Хуманистичном" № 3/1980 г. и проект анекса к авторскому праву.

Спасибо Вам большое за Ваше оценки и идеи, как расширить деятельность рубрики /перепечатывание и т.п./.

./.

Secrétariat du Congrès
Congress Secretariat Office

AGENCJA AUTORSKA
00-950 Warszawa, ul. Hipoteczna 2
Skr. pocztowa 133, Post Box 133

Ліст Зыгмунта Статберскага, старшыні аргкамітэта IX Сусветнага кангрэса Міжнароднай федэрацыі тэрміналагічных банкаў. 7 лістапада 1980 г.



\- 2 -

Ваши предложения на столько интересны, что я хотел бы, чтобы Вы выступили на Конгрессе в Варшаве, как только с этими предложениями. Это было большое достижение советской делегации из Белорусской ССР.

Жду заглавий Ваших докладов и данных о Ваших делегатах, чтобы Вас представить участникам Конгресса.

С уважением и дружеским приветом

/Зигмунт Стоберски/

Председатель Организационного
Комитета IX Всемирного Конгресс
ФИТ в Варшаве

Ліст Зыгмунта Стаберскага, старшыні аргкамітэта IX Сусветнага кангрэса Міжнароднай федэрацыі тэрміналагічных банкаў. 7 лістапада 1980 г. (Працяг).



З супрацоўнікамі Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук БССР.
Другая палова 1980-х гг.



АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛОРУССКОЙ ССР
БЮРО ПРЕЗИДИУМА АКАДЕМИИ НАУК

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

31 декабря 1981 года г. Минск № 292

Об участии ученого секретаря Терминологической комиссии АН БССР к.ф.н. Антонюк Л.А. в работе Международного Комитета унификации терминологических неологизмов (МКУТН)

Бюро Президиума Академии наук БССР ПОСТАНОВЛЯЕТ:

Согласиться с предложением Института языкознания им. Я.Коласа АН БССР о разрешении ученому секретарю Терминологической комиссии АН БССР к.ф.н. Антонюк Л.А. принять участие в работе Международного Комитета унификации терминологических неологизмов (МКУТН) в качестве заместителя Президента Мирового Банка интернациональных терминов.

Президент
Академии наук БССР
академик Н.А.Борисевич

Главный ученый секретарь
Президиума АН БССР
академик АН БССР Л.И.Киселевский

Пастанова Акадэміі навук БССР аб удзеле Л.А.Антанюк у рабоце Міжнароднага камітэта па ўніфікацыі тэрміналагічных неалагізмаў. 31 снежня 1981 г.

Маці часта ўдзельнічала ў навуковых мерапрыемствах. Памятаем, як аднойчы яна ўзяла нас з сабою ў Маскву, калі ехала на адзін з кангрэсаў. Яна вельмі хацела, каб мы пабачылі гэты горад, наведалі Маскоўскі заапарк. Гэта было цудоўнае падарожжа…



Любоў Адамаўна з дочкамі Марынай і Надзеяй (злева)
у Маскоўскім заапарку.1985 г.

У 1991 г. Любоў Адамаўна перайшла на кафедру сучаснай беларускай мовы БДУ. У 1998 г. ёй прапанавалі стварыць і ўзначаліць кафедру беларусазнаўства ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, дзе яна і працавала да канца свайго жыцця. Супрацоўнікамі маці на кафедры былі такія выдатныя беларускія навукоўцы, як прафесар Плотнікаў Б. А., прафесар Старычонак В. Д., прафесар Іўчанкаў В. І., дацэнт Капылоў І. Л. Гэты перыяд быў плённым для Любові Адамаўны. Апублікаваны многія яе працы, у тым ліку вучэбныя дапаможнікі: «Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія», «Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне», «Сінтаксіс беларускай мовы. Сказ». Сумесна з прафесарам Б. А. Плотнікавым выдадзены «Беларуская мова.

Лінгвістычны кампендыум», падручнік «Беларуская мова: прафесійная лексіка», па якіх студэнты навучаюцца і сёння.

Марына Антанюк-Пруто: Мне пашчасціла працаваць у такім выдатным навуковым калектыве. Гэта была невялікая, але вельмі значная кафедра з утульнай і прыемнай атмасферай. Я ганаруся тым, што працягваю справу маёй маці, займаюся праблемамі тэрміналогіі, абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэрміналогіі права,з’яўляюся кандыдатам філалагічных навук, навучаюся ў дактарантуры. Кнігі маці заўсёды былі для мяне настольнымі.



Выступленне на канферэнцыі ў БДУ. Пачатак 2000-х гг.

Мы дзякуем Богу за такога настаўніка ў сваім жыцці. Наша маці заўсёды скіроўвала нас на атрыманне адукацыі, яна верыла ў сілу асветы і навукі. Акрамя таго, яна дапамагала ўсім, хто да яе звяртаўся, знаёмым і чужым людзям, чым толькі магла, асабліва калі справа датычылася адукацыі. Нам здаецца, яна бачыла ў гэтым сваё асноўнае прызначэнне.

У нашай маці былі па-сапраўднаму вялікая душа і мужнае сэрца!

Па сённяшні дзень мы чуем ад калег, былых аспірантаў і студэнтаў, ад сяброў і суседзяў словы ўдзячнасці ў адрас нашай матулі і самыя цёплыя ўспаміны. І гэта вельмі саграває нашы сэрцы і душы.



З дзецьмі: дочкамі Надзеяй (злева) і Марынай (справа) і сынам Аляксандрам,
г. Туапсэ. Вясна 1999 г.

Мы выказваем вялікую ўдзячнасць ад усёй нашай сям'і загадчыку кафедры беларускага мовазнаўства БДУ, доктару філалагічных навук, прафесару Прыгодзічу Мікалаю Рыгоравічу, кандыдату філалагічных навук, дацэнту Свістуновай Марыне Іосіфаўне, усім супрацоўнікам кафедры за памяць і арганізацыю навуковых чытанняў у гонар Любові Адамаўны Антанюк. Дзякуемтаксама дэкану філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктару філалагічных навук, прафесару Старычонку Васілю Дзянісавічу,дырэктару Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, кандыдату філалагічных навук, дацэнтуКапылову Ігару Лявонавічу, загадчыку аддзела сучаснай беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, доктару філалагічных навук, дацэнту Русак Валянціне Паўлаўне, кандыдату філалагічных навук дацэнту Гваздовіч Галіне Аляксандраўне, усім тым, хто выступіў з цёплымі і шчырымі словамі, усім, хто прымаў удзел у чытаннях і даслаў артыкулы для зборніка – усім, хто памятае нашу Маці.